этнографических границах. Белорусы выражали неудовлетворенность тем, что условия договора предусматривали отторжение части белорусской территории на западе и юге, а также тем, что договор не предусматривает выплату компенсации белорусскому населению за ущерб, причиненный в ходе военных действий. Однако немцы встретили появление белорусской делегации холодно, отметив, что она прибыла слишком поздно. Сославшись на то, что Брест-Литовский трактат ущемляет белорусские интересы в незначительной мере, они отказались вносить в его текст какие-либо изменения. Советский представитель Л. М. Карахан встречаться с белорусами не стал.

Хотя ССРБ 1 января 1919 г. и была провозглашена суверенным и независимым государством, но военно-политические и социально-экономические обстоятельства не способствовали укреплению ее независимости.

**Список использованных источников**


1. Документы внешней политики СССР: в 24 т. / А. А. Громыко [и др.]. – М.: Госполитиздат: Междунар. отношения, 1959–2000. – Т. 1: 7 ноября 1917 г. – 31 декабря 1918 г. / И. Н. Деев [и др.]. – 1957.

2. *Людендорф, Э.* Мои воспоминания о войне. 1914–1918: в 2 т. / Э. Людендорф; под ред. А. Свечина; пер. с нем. – М.: Высш. воен. ред. совет, 1923–1924. – Т. 2. – 1924. – 316 с.

3. Знешняя палітыка Беларусі: зб. дак. і матэрыялаў: у 3 т. / Пастаян. каміс. Савета Рэсп. Нац. сходу Рэсп. Беларусь па міжнар. справах і нац. бяспецы, М-ва замеж. спраў Рэсп. Беларусь. – Мінск: БелНДІАС, 1997–2001. – Т. 1: (1917–1922 гг.). – 1997.

4. Советско-германские отношения от переговоров в Брест-Литовске до подписания Рапалльского договора: сб. док.: в 2 т. / редкол.: С. Дернберг [и др.]. – М.: Политиздат, 1968–1971. – Т. 1: 1917–1918 гг. – 1968.

5. Хронос. Всемирная история в интернете. Брестский мир [Электронный ресурс]. – 2012. – Режим доступа: www. hrono.ru/dokum/191_dok/19180303brest.php. – Дата доступа: 02.02.2016.

6. *Тихомиров, А. В.* Брестский мир 1918 г. и Беларусь / А. В. Тихомиров // Белорус. журн. междунар. права и междунар. отношений. – 1999. – № 2. – С. 57–77.


**(Дата подачи: 02.02 2016 г.)**


*Л. В. Мікалаева*

Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт інфарматыкі і радыёэлектронікі, Мінск

*L. V. Mikalayeva*

The Belarusian State University of Informatics and Radioelectronics, Minsk


**УДК 327.8(474.5)**

# СПЕЦЫФІКА ДАКУМЕНТАЛЬНЫХ КРЫНІЦ ПРЫ ВЫВУЧЭННІ ПРАБЛЕМАТЫКІ ЗНЕШНЯЙ ПАЛІТЫКІ ВЯЛІКАГА КНЯСТВА ЛІТОЎСКАГА Ў КАНЦЫ XIV – СЯРЭДЗІНЕ XVI СТ.

# THE SPECIFICITY OF THE DOCUMENTARY SOURCES FOR STUDYING THE PERSPECTIVE OF THE FOREIGN POLICY OF THE GRAND DUCHY OF LITHUANIA AT THE END OF THE XIV – MID XVI CENTURY

*У артыкуле разглядаецца спецыфіка дакументальных крыніц пры вывучэнні знешняй палітыкі Вялікага Княства Літоўскага канца XIV – сярэдзіны XVI ст. на прыкладзе Метрыкі Вялікага Княства Літоўскага. Аналізуюцца існуючыя класіфікацыі пасольска-дыпламатычнай дакументацыі. Робіцца вывад, што існуюць цяжкасці відавога размежавання шэрагу дакументальных крыніц, якія маюць рысы розных груп, што дакументальныя крыніцы Метрыкі Вялікага Княства Літоўскага маюць выключную важнасць для даследавання знешняй палітыкі дадзенай дзяржавы.*

*Ключавыя словы: крыніцы; знешняя палітыка; Вялікае Княства Літоўскае; даследаванне; класіфікацыя.*

*In the article the specificity of documentary sources in the study of foreign policy of the Grand Duchy of Lithuania of the end XIV – mid XVI century by the example of «the Metrics of the Grand Duchy of Lithuania». Analyzes the existing classification of the Embassy-diplomatic documentation. It is concluded that there are problems in species delimitation of a number of documentary sources having traits of different groups, and that documentary sources «Metrics of the Grand Duchy of Lithuania» have exceptional importance for the study of foreign policy of the state.*

*Key words: sources; foreign policy; the Grand Duchy of Lithuania; a study; classification.*

Знешняя палітыка – гэта сфера дзейнасці пэўных суб’ектаў на міжнароднай арэне, якая рэгулюе стасункі з іншымі суб’ектамі знешнепалітычнай дзейнасці. У познім Сярэднявеччы і пачатку Новага часу імі з’яўляліся толькі дзяржавы. Адной з іх было Вялікае Княства Літоўскае (далей – ВКЛ). Геапалітычнае становішча ВКЛ гістарычна дамінавала ў выбары ім партнёраў і развіцці ўзаемаадносін з праціўнікамі.

Традыцыйнай формай ажыццяўлення знешняй палітыкі суб’ектаў міжнародных адносін у разглядаемы перыяд з’яўлялася ўстанаўленне дыпламатычных стасункаў паміж дзяржавамі. Як і кожная краіна, ВКЛ мела на міжнароднай арэне свае асобыя інтарэсы і задачы, пры дасягненні якіх яно магло ўступаць у супярэчнасці з інтарэсамі іншых дзяржаў. Крайняй формай вырашэння гэтых супярэчнасцяў былі войны, галоўным інструментам вядзення якіх з’яўлялася войска. Акрамя таго, палітычна значымыя вынікі часам дасягаліся шляхам сістэматычнага ўздзеяння на свядомасць людзей з выкарыстаннем розных метадаў пераканання. Выкарыстоўваючы гэтыя палітычныя, ваенныя і ідэалагічныя сродкі, ВКЛ імкнулася дасянуць сваіх знешнепалітычных мэтаў.

Некалькі асобна стаіць пытанне кіраўніцтва і кантролю за гэтай сферай. Аднак усе гэтыя структурныя часткі – кіраўніцтва, асноўныя сродкі, формы і метады рэалізацыі, напрамкі ажыццяўлення знешняй палітыкі ВКЛ канца XIV – сярэдзіны XVI ст. – патрабуюць узважанага падыходу да іх разгляду. У сувязі з гэтым важнае значэнне набывае база крыніц даследавання.

Пры вывучэнні праблематыкі знешняй палітыкі ВКЛ у канцы XIV – сярэдзіне XVI ст. існуе магчымасць абаперціся на шырокі корпус пісьмовых крыніц, якія, згодна з існуючай традыцыйнай класіфікацыяй, можна падзяліць на дакументальныя і апавядальныя.

Дакументальныя крыніцы, якія могуць выкарыстоўвацца для даследавання пытанняў знешнепалітычнай праблематыкі, падзяляюцца на тры групы: заканадаўчыя, актавыя і матэрыялы справаводства.

У сваю чаргу ўсе пералічаныя групы крыніц па спосабу фіксацыі тэксама можна ўмоўна падзяліць на рукапісныя (архіўныя) і апублікаваныя.

У дадзеным артыкуле разгледзім спецыфіку дакументальных крыніц пры вывучэнні знешнепалітычнай праблематыкі на прыкладзе матэрыялаў Метрыкі Вялікага Княства Літоўскага – складанага комплексу матэрыялаў, які ўтрымлівае дакументацыю справаводства спачатку вялікакняжацкай, а потым дзяржаўнай канцылярыі ВКЛ сярэдзіны XV – канца XVIII ст.

У наш час дакументацыя, звязаная з дзейнасцю канцылярыі ВКЛ, захоўваецца ў архівах чатырох дзяржаў. Дакументы Метрыкі Вялікага Княства Літоўскага склалі аснову архіўнага фонду «Літоўская метрыка», які пад № 389 захоўваецца ў Расійскім дзяржаўным архіве старажытных актаў у Маскве. Шэраг матэрыялаў «Метрыкі» захоўваецца ў фондзе «Tak zwana Metryka Litewska» Галоўнага архіва старажытных актаў у Варшаве. Часткова фільмакопіі Метрыкі Вялікага Княства Літоўскага захоўваюцца ў Дзяржаўным гістарычным архіве Літвы ў Вільнюсе (фонд 1519). У дадзеным артыкуле будзем спасылацца на іх фотакопіі, якія захоўваюцца ў Нацыянальным гістарычным архіве Беларусі ў Мінску (фонд КМФ-18).

Дакументацыя, што выходзіла са сцен дзяржаўнай канцылярыі ВКЛ і мела непасрэднае дачыненне да знешнепалітычнай праблематыкі, па функцыянальным прызначэнні ўмоўна падзяляецца на дзве групы: фінансава-ваенна-мабілізацыйную і пасольска-дыпламатычную. Да першай адносіліся: «лісты ваенныя», якімі абвяшчаўся пачатак мабілізацыйных мерапрыемстваў, час і месца збору паспалітага рушання ў выпадку распачынання ваенных дзеянняў супраць праціўніка ці для аказання адпору мяркуемаму нападу ворага [1, арк. 535–538; 2, арк. 90 адв. – 91 адв.; 3, арк. 301–303 адв.]; лісты, якімі паведамляўся памер і парадак збору надзвычайных падаткаў (сярэбшчыны, пагалоўшчыны, паканёўскіх пенязяў) на ваенныя патрэбы [3, арк. 24 адв. – 26 адв.; 4, арк. 264 адв. – 266]; дакументы, што афармлялі ўхвалы соймаў і нарад паноў Рады з гаспадаром адносна нормы выстаўляемых коней і выплачваемых надзвычайных падаткаў [1, арк. 1230–1233; 5, арк. 27–29 адв., 88–90]; «застаўныя» лісты, па якіх атрымлівалі грошы на дзяржаўныя патрэбы, у большасці выпадкаў звязаныя з ваеннымі аперацыямі і ўтрыманнем наёмнага войска [2, арк. 25–27 адв., 28 адв. – 29 адв., 31, 33–34 адв.]; «ваенныя ўставы», што нармавалі ўзаемаадносіны войска з цывільным насельніцтвам падчас ваенных дзеянняў [3, арк. 77 адв. – 78 адв.]; «попіс» паспалітага рушання [6] і інш.

Гэтыя дакументы, якія, на першы погляд, былі звязаны толькі з унутраным жыццём дзяржавы, на самай справе маюць поліфункцыянальны характар. Без азнаямлення з імі немагчыма ўявіць усю паўнату разглядаемай праблемы. У першую чаргу гэта звязана з тым, што яны дазваляюць праліць святло на адну з прычын няўдач пры выкарыстанні ваенных сродкаў для дасягнення знешнепалітычных мэтаў: мабілізацыйныя мерапрыемствы зацягвалі пачатак ваенных аперацый, што дазваляла праціўніку адразу перахапіць ініцыятыву ў ходзе баявых дзеянняў, а пераламіць яе на сваю карысць пазней было вельмі складана. Акрамя таго, яны паказваюць крыніцы і механізм фінансавання знешнепалітычных акцый той эпохі, прычым не толькі ваенных, але і дыпламатычных, даюць магчымасць вызначыць прыкладны колькасны склад паспалітага рушання і тым самым удакладніць колькасныя характарыстыкі часткі войска ВКЛ як аднаго са сродкаў рэалізацыі знешняй палітыкі і г. д.

У склад другой групы крыніц уваходзілі разнастайныя дакументы, прама звязаныя са сферай дыпламатыі і з выкананнем пасольскіх місій. Да нашых дзён створаны па меншай меры чатыры класіфікацыі гэтай дакументацыі. Першая класіфікацыя, аўтарам якой з’яўляецца расійская даследчыца К. І. Індава, распрацавана ў дачыненні да маскоўскай дыпламатычнай дакументацыі, аднак можа быць выкарыстана і для літвінскіх папер гэтага тыпу [7, с. 302–307]. У аснову класіфікацыі быў пакладзены змест дакументаў, у выніку чаго даследчыцай былі выдзелены пяць іх груп:

1) дакументы на права на пасольства і пра забеспячэнне харчам і сродкамі руху («апасныя» і «падарожныя» граматы);

2) асабістыя дакументы паслоў («вярыцельныя» граматы, маскоўскія «памяти» ці літвінскія «навукі» паслам);

3) прамовы (пасольскія, размоўныя, прамовы ў адказ);

4) дакументы дзяржаўныя («даканчанні», што ўтрымлівалі ўмовы міру ці перамір’я);

5) справаздачы паслоў (у літвінскай дакументацыі сустракаюцца адзінкавыя экзэмпляры).

У аснову класіфікацыі пасольскай дакументацыі ВКЛ, прапанаванай расійскай даследчыцай Г. Л. Харашкевіч, было пакладзена паходжанне дакументаў. На аснове гэтага крытэрыю аўтарам класіфікацыю выдзяляліся шэсць груп дакументаў [8, с. 37]:

1) цякучая дыпламатычная перапіска (пасланні, дастаўляемыя ганцамі);

2) дакументы, звязаныя з выездам упаўнаважаных прадстаўнікоў дзяржавы за яе межы з дыпламатычнай місіяй («вярыцельныя» граматы, «наказы», «навукі» паслам);

3) дакументы, якія ўзніклі ў ходзе выканання пасольстваў (справаздачы паслоў);

4) дакументы, якія афармлялі знаходжанне дыпламатычных прадстаўнікоў іншых дзяржаў на тэрыторыі ВКЛ («апасныя» лісты, «апасы», «глейты») і гарантавалі бяспеку іх прыезда і ад'езда;

5) дакументы, якія фіксавалі ўстанаўленне добрасуседскіх адносін з суседнімі дзяржавамі (дамоўныя і ратыфікацыйныя граматы);

6) дакументы, з дапамогай якіх ажыццяўляўся разрыў дыпламатычных адносінаў з іншымі дзяржавамі («отказные» граматы).

Трэцяя класіфікацыя была прапанавана літоўскім даследчыкам Э. Д. Банёнісам [9, с. 17–18], які прапанаваў падзяліць усю дакументацыю, выдаваемую канцылярыяй ВКЛ для патрэб паслоў, на дзве групы:

1) дакументы паслоў («вярыцельныя», «падводныя», «апасныя» граматы,  а таксама мандаты);

2) дыпламатычныя дакументы (прамовы паслоў, тэксты пасольстваў, адказы замежным паслам, міжнародныя дамовы і г. д.).

Чацвёртая класіфікацыя была прапанавана беларускім вучоным У. І. Канановічам [10, с. 39]. На жаль, аўтар не ўдакладніў, па якой прыкмеце ўся пасольская дакументацыя была падзелена ім на тры групы, аднак можна выказаць меркаванне, што ў якасці крытэрыю было выкарыстана іх функцыянальнае прызначэнне:

1) асабістыя дакументы паслоў, якія сведчылі пра асобу пасла, фіксавалі ўмовы праезду пасла да пункта прызначэння за мяжой, знаходжання там і вяртання назад («вярыцельныя», «апасныя» («глейтоўныя») лісты, «падарожныя» («падводныя», «праезджы») лісты, а таксама «мандаты»);

2) дакументы, прызначаныя непасрэдна для выканання канкрэтнага дыпламатычнага даручэння (інструкцыі («навукі») паслам, тэксты іх прамоў на аўдыенцыях і перамовах);

3) дакументы, што з'яўляліся вынікам пасольства і ў якіх падсумоўваліся яго вынікі (міждзяржаўныя дамовы і пагадненні, справаздачы паслоў, а таксама «размётныя» («складныя») граматы).

Як падаецца, апошняя класіфікацыя найбольш удала вызначае магчымыя межы класіфікацыйных груп пасольска-дыпламатычнай дакументацыі і дазваляе пазбавіцца груваcткай дробнасці дзвюх першых і пэўнай схематычнасці трэцяй, хаця яны таксама маюць права на існаванне. Адзіная заўвага, якую можна зрабіць, звязана з прапановай уключыць у другую класіфікацыйную групу такія тыпы дакументаў, як матэрыялы цякучай дыпламатычнай перапіскі і «обидные» спіскі. Тады апошняя класіфікацыя будзе ахопліваць усю шматлікасць пасольска-дыпламатычнай дакументацыі.

Фактычна амаль усе матэрыялы фонда КМФ-18, якія маюць дачыненне да праблематыкі знешняй палітыкі ВКЛ у канцы XIV – сярэдзіне XVI ст., адносяцца да дакументальных актавых крыніц публічна-прававога характару. Акрамя таго, шэраг дакументаў можна аднесці да матэрыялаў справаводства, як, напрыклад, пасольскія «навукі», «лісты ваенныя», соймавыя лісты і інш. Аднак спецыфіка дзейнасці канцылярыі ВКЛ і фарміравання

фонда «Літоўская метрыка» ўскладняюць вылучэнне ўласна справаводчай дакументацыі з усяго корпуса названых крыніц.

Як вядома, Метрыка Вялікага Княства Літоўскага – комплексная крыніца, якая складаецца з копій тэкстаў разнастайных дакументаў, у тым ліку дыпламатычных, што выдаваліся канцылярыяй ВКЛ з сярэдзіны XV і да канца XVIII ст. Гэтыя копіі заносіліся ў розныя «кнігі» (ці «сшыткі») па тэматычнай прыкмеце. У канцы XVI ст. усе «кнігі», якія накапіліся за XV–XVI стст. і да таго часу, значна абвятшалі, таму распараджэнні канцлера Льва Сапегі сталі перапісвацца ў кнігі-копіі. Перапіска праводзілася без папярэдняй апрацоўкі ці сістэматызацыі дакументацыі, у выніку чаго ў кнігах-копіях, асабліва тых, што ахоплівалі дакументацыю канца XV–XVI ст., назіраецца відавая і храналагічная непаслядоўнасць тэкстаў дакументаў. Да нашага часу дайшлі менавіта гэтыя кнігі-копіі, што ўтрымліваюць дакументацыю XV–XVI стст., і подлінныя кнігі, створаныя на працягу XVII–XVIII стст. [11, с. 17–18].

Адзначаная вышэй відавая і храналагічная непаслядоўнасць тэкстаў дакументаў характэрна практычна амаль усім копіям кніг-копій, якія былі выкарыстаны намі. Некаторае выключэнне адносна відавога складу дакументаў мае кніга запісаў № 7, амаль цалкам занятая пасольскімі справамі з татарскімі Ордамі, Масковіяй, Польшчай, Малдавіяй, Венгрыяй, Інфлянтамі, Швецыяй, імперыяй Габсбургаў перыяду княжання вялікага князя Жыгімонта Казіміравіча [1].

У складзе фонда КМФ-18, акрамя дакументацыі канцылярыі ВКЛ, знаходзяцца і некаторыя пасольскія кнігі Вялікага Княства Маскоўскага (напрыклад, справа № 588) [12], напэўна, вывезеныя ў пачатку XVII ст. са сталіцы рускай дзяржавы.

Такім чынам, спецыфічнай рысай пісьмовых крыніц сярэдзіны XV – сярэдзіны XVI ст., якія паходзяць з канцылярыі ВКЛ, з'яўляецца наяўнасць у шэрагу дакументаў рыс, уласцівых як актавым крыніцам, так і дакументам справаводства, ці, напрыклад, актавым і заканадаўчым крыніцам, што робіць складаным іх дакладнае відавое размежаванне.

Дакументацыя Метрыкі Вялікага Княства Літоўскага ўвайшла ў склад шматлікіх публікацый. Так, яшчэ ў канцы 20-х гг. XIX ст. была створана першая Археаграфічная камісія, якая з канца 40-х гг. XIX ст. пачала выданне «Актов, относящихся к истории Западной России», у першыя тры тамы якіх увайшлі і крыніцы па гісторыі знешняй палітыкі ВКЛ у канцы XIV – сярэдзіне XVI ст. [13–15]. Дакументы, што датычацца закранаемай у нашым артыкуле праблематыкі, у асноўным друкаваліся па копіях кніг-копій Метрыкі Вялікага Княства Літоўскага, а таксама рукапісных матэрыялах Галоўнага Архіва Міністэрства Замежных Спраў у Маскве. Апошнія пазней былі надрукаваны ў 35-м томе «Сборника Русского исторического общества» [16]. Першыя тамы «Актов» – гэта фактычна падборка дакументаў, якія павінны былі апраўдаць экспансію Вялікага Княства Маскоўскага

на ўсходнія землі ВКЛ. Таму вялікая ўвага была нададзена праваслаўнай царкве, каб паказаць яе прыгнечанае становішча, што не адпавядала рэчаіснасці. Матэрыялы Метрыкі Вялікага Княства Літоўскага ўвайшлі ў зборнікі «Документы Московского Архива Министерства Юстиции» [17] і «Описание документов и бумаг, хранящихся в Московском архиве Министерства Юстиции» [18]. Істотным дапаўненнем да згаданых вышэй выданняў з'яўляюцца зборнікі дакументаў змешанага зместу, зробленыя на падставе Метрыкі Вялікага Княства Літоўскага [19–21]. Яе матэрыялы, што адлюстроўваюць дыпламатычныя адносіны ВКЛ з Крымам у час праўлення хана Менглі-Гірэя, сабраны ў тэматычным зборніку, выдадзеным К. Пуласкім [22]. У пачатку XX ст. актывізавалася публікатарская дзейнасць Археаграфічнай камісіі, якая ажыццявіла выданне чатырох тамоў у серыі «Руская гістарычная бібліятэка» («Русская историческая библиотека»), куды ўвайшлі матэрыялы кніг Метрыкі Вялікага Княства Літоўскага. З тых частак серыі, якія маюць карысць для вывучэння пытанняў знешняй палітыкі ВКЛ, на думку даследчыкаў, асабліва высокім археаграфічным узроўнем вызначаюцца том 27 (кнігі запісаў № 3, 4 і часткова 5) [23], падрыхтаваны І. І. Лапай, і том 33 (попісы войска ВКЛ 1528, 1565 і 1567 гг.) [24], падрыхтаваны С. Л. Пташыцкім [25, с. 308]. Зразумела, што пералік усіх публікацый матэрыялаў «Метрыкі», якія праліваюць святло на знешнепалітычную праблематыку ў канцы XIV – сярэдзіне XVI ст., можна працягваць далей.

З пачатку 90-х гг. XX ст. літоўскія навукоўцы пачалі выданне шэрагу кніг Метрыкі Вялікага Княства Літоўскага ў серыі «Літоўская метрыка». На сучасны момант з тых кніг, якія могуць быць выкарыстаны для даследавання пытанняў знешняй палітыкі ВКЛ у канцы XV – сярэдзіне XVI ст., апублікаваны кнігі запісаў № 5 [26], № 8 [27], № 10 [28], № 11 [29]. Выданне кніг запісаў № 28 [30] і № 44 [31], якія ўтрымліваюць дыпламатычную дакументацыю за перыяд, які цікавіць нас, ажыццявілі ў 2000–2001 гг. беларускія даследчыкі. У 2003 г. беларускія навукоўцы выдалі попіс войска ВКЛ 1528 г. [32]

Значэнне матэрыялаў Метрыкі Вялікага Княства Літоўскага для вывучэння праблематыкі знешняй палітыкі ВКЛ канца XIV – сярэдзіны XVI ст., асабліва за перыяд канца XV – сярэдзіны XVI ст., цяжка пераацаніць, бо яны фактычна з'яўляюцца тым кладзезем інфармацыі, якая на сённяшні дзень вельмі мала ці зусім не прыцягвалася для разгляду ўказанай тэмы. Змест дыпламатычнага ліставання, тэксты пасольстваў, вярыцельных і ахоўных лістоў, разнастайныя «навукі» паслам і г. д. утрымліваюць надзвычай каштоўную інфармацыю як па зносінах ВКЛ з іншымі дзяржавамі, так і па ўнутранай структуры арганізацыі знешнепалітычнай службы ВКЛ і з'яўляюцца вельмі каштоўнай аўтэнтычнай крыніцай па пытаннях знешняй палітыкі ВКЛ, закранаючы амаль усе складаючыя гэтай з'явы. Апошняе дазваляе лічыць матэрыялы «Метрыкі» найбольш значным фундаментам пры даследаванні пытанняў знешняй палітыкі ВКЛ.

## Спіс выкарыстаных крыніц


1. Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі (НГАБ). – Фонд КМФ-18. – Воп.1. – Спр. 7.

2. НГАБ. – Фонд КМФ-18. – Воп. 1. – Спр. 10.

3. НГАБ. – Фонд КМФ-18. – Воп. 1. – Спр. 19.

4. НГАБ. – Фонд КМФ-18. – Воп. 1. – Спр. 15.

5. НГАБ. – Фонд КМФ-18. – Воп. 1. – Спр. 526.

6. НГАБ. – Фонд КМФ-18. – Воп. 1. – Спр. 523.

7. *Индова, Е. И.* Русская посольская служба в конце XV – первой половине XVI в. / Е. И. Индова // Феодальная Россия во всемирно-историческом процессе: сб. ст., посвящ. Л. В. Черепнину. – М.: Наука, 1972. – С. 294–311.

8. *Хорошкевич, А. Л.* Посольская документация ВКЛ в конце XV – начале XVI в. / А. Л. Хорошкевич // Литовская Метрика: тезисы докл. межресп. науч. конф., апрель 1988 г. – Вильнюс: Ин-т истории АН ЛитССР, 1988. – С. 36–38.

9. *Банёнис, Э. Д.* Посольская служба Великого Княжества Литовского (середина XV в. – 1569 г.): автореф. дис. … канд. ист. наук: 00.07.02 / Э. Д. Банёнис; Ин-т истории АН Литвы. – Вильнюс, 1982. – 21 с.

10. *Кананові, У. І.* Дыпламатыя Вялікага княства Літоўскага ў 1480 – першай чвэрці XVI ст. (адносіны з Вялікім княствам Маскоўскім і Крымскім ханствам): дыс. ... канд. гіст. навук: 07.00.02 / У. І. Кананові. – Мінск, 1997. – 95 с.

11. *Бережков, Н. Г.* Литовская Метрика как исторический источник / Н. Г. Бережков. – М.-Л.: Изд-во АН СССР, 1946. – Ч. 1: О первоначальном составе книг Литовской Метрики по 1522 год. – 179 с.

12. НГАБ. – Фонд КМФ-18. – Воп. 1. – Спр. 588.

13. Акты, относящиеся к истории Западной России, собранные и изданные Археографическою комиссиею: в 5 т. – СПб.: Тип. II отд-ния собств. Е. И. В. канцелярии, 1846. – Т. 1: 1340–1506. – 375 с., [39] с.

14. Акты, относящиеся к истории Западной России, собранные и изданные Археографическою комиссиею: в 5 т. – СПб.: Тип. II отд-ния собств. Е. И. В. канцелярии, 1848. – Т. 2: 1506–1544. – III, 405, [ 39 ] с.

15. Акты, относящиеся к истории Западной России, собранные и изданные Археографическою комиссиею: в 5 т. – СПб.: Тип. Э. Праца, 1848. – Т. 3: 1544–1587. – VIII, VI, 317, [ 31 ] с.

16. Памятники дипломатических сношений Московского государства с Польско-Литовским Т. 1: 1487–1533 / под ред. Г. Ф. Карпова // Сборник Императорского Русского Исторического Общества. – СПб.: Тип. Ф. Елеонского, 1882. – Т. 35. – VI, 869, XII с.

17. Документы Московского Архива Министерства Юстиции. – М.: Тип. т-ва Мамонтова, 1897. – Т. 1. – XXIV, 570 с.

18. Описание документов и бумаг, хранящихся в Московском архиве Министерства юстиции: в 21 кн. – М.: Скоропечат. А. А. Левинсон, 1915. – Кн. 21. – XI, 592 с.

19. Акты Литовской метрики // Собр. проф. Имп. Варшав. университета Ф. И. Леонтовичем. – Варшава: Тип. Варшав. учеб. округа, 1896. – Т. 1. – Вып.1: 1413–1498 гг. – 169 с.

20. Акты Литовско-Русского государства / изд. М. Довнар-Запольским. – М.: Унив. тип., 1899. – Вып. I: 1390–1529. – 258 с.

21. *Муханов, П.* Сборник документов по русской истории / П. Муханов. – 2-е изд., доп. – СПб.: Тип. Э. Праца, 1866. – 4, XXXVI, XVIII, 622, LVII, 30 с.

22. Stosunki z Mengli-Girejem chanem Tatarów Perekopskich (1469–1515): Akta i listy wydał i szkicem historycznym poprzedił Kazimierz Pułaski // Stosunki Polski z Tatarszczyzną od polowy XV wieku. – Kraków: Gebethner i spólka. – Warszawa: Gebetner i Wolff, 1881. – T. 1. – 449 s.

23. Русская историческая библиотека, издаваемая императорскою Археографическою комиссиею: в 39 т. – СПб.: Сенат. тип., 1910. – Т. 27: Литовская метрика: Отд. 1. Ч. 1: Книги записей. – Т. 1 / ред. И. И. Лаппо. – [38], 872 стб., 660 с.

24. Русская историческая библиотека, издаваемая императорскою Археографическою комиссиею: в 39 т. – Петроград: Тип. Главн. упр. уделов, 1915. – Т. 33: Литовская метрика: Отд. 1. Ч. 3: Книги публичных дел. Переписи войска Литовского. – Т. 1 / ред. С. Л. Пташицкий. – II, 1378 стб., 702 с.
25. *Галенчанка, Г.* Метрыка Вялікага княства Літоўскага / Г. Галенчанка, М. Спірыдонаў // Вялікае княства Літоўскае: энцыклапедыя: у 2 т. / рэдкал.: Г. П. Пашкоў (гал. рэд.) [і інш.]; маст. З. Э. Герасімовіч. – Мінск: БелЭн, 2006. – Т. 2: Кадэцкі корпус – Яцкевіч. – 792 с.
26. Литовская метрика = Lietuvos metrika / Ин-т истории Литвы. – Вильнюс: Mokslo ir ehciklopediju leidykla, 1993. – Кн. 5: Книга записей (1427–1506) / [подгот. Э. Банионис]. – 402 с., 4 л. факс.
27. Литовская метрика = Lietuvos metrica / Ин-т истории Литвы. – Вильнюс: Mokslo ir ehcikloediju leidykla, 1995. – Кн. 8: Книга записей (1499–1514) / [подгот. А. Балюлис и др.]. – 708 с.
28. Литовская метрика = Lietuvos metrika / Ин-т истории Литвы.- Вильнюс: Mokslo ir ehciklopdiju leidykla, 1997. – Кн. 10: Книга записей (1440–1523) / [подгот.: Э. Банионис, А. Балюлис]. – 178 с.
29. Литовская метрика = Lietuvos metrika / Ин-т истории Литвы. – Вильнюс: Mokslo ir ehciklopediju leidykla, 1997. – Кн.11: Книга записей (1518–1523) / [подгот. А. Дубонис]. – 227 с.
30. Метрыка Вялікага Княства Літоўскага. – Менск: ATHENAEUM, 2000. – Кн. 28 (1522–1552 гг.). Кніга запісаў 28 / падр. тэкстаў да друку і навук. апарат: В. Мянжынскі, У. Свяжынскі. – 312 с.: іл. 8.
31. Метрыка Вялікага княства Літоўскага. – Менск: Арты-Фэкс, 2001. – Кн. 44: Кніга запісаў 44 (1559–1566) / падрыхт. А. І. Груша. – 229 с.: іл.
32. Перапіс войска Вялікага княства Літоўскага 1528 года: Метрыка Вялікага княства Літоўскага. – Менск: Беларус. навука, 2003. – Кн. 523. Кніга публічных спраў 1 / падрыхт. А. І. Груша, М. Ф. Спірыдонаў, М. А. Вайтовіч. – 440 с.

**(Дата подачи: 18.02.2016 г.)**

*Л. И. Мосейчук*
Центр проблем развития образования БГУ, Минск
L.I. Mosejchuk
Education Development Center BSU, Minsk

**УДК 947.6**

# ПОЛОЦКАЯ УНИАТСКАЯ СЕМИНАРИЯ: ОСНОВАНИЕ И РАСЦВЕТ

# POLOTOSK UNIATE SEMINARY: FOUNDATION AND FLOURISHING

*В статье анализируются эволюция учебной программы и административного устройства Полоцкой униаткой семинарии с момента ее основания (1807 г.) и до 1823 г. Описываются бытовые условия, в которых жили семинаристы, и их численный состав. Рассматриваются источники финансирования семинарии.*

*Ключевые слова: семинария; униатское духовное образование; униатство; учебный процесс; система воспитания.*